

# Стагадовы юбілей "дыямента" ведаў

**Нацыянальная бібліятэка Беларусі 15 верасня адзначыла 100 гадоў з дня заснавання. Юбілей бібліятэкі мае сусветнае значэнне і занесены ў каляндар памятных дат UNESCO.**

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь **Аляксандр Лукашэнка** павіншаваў калектыў установы са святочнай датай.

"Установа з'яўляецца невычэрпнай крыніцай інфармацыі для грамадства. Амаль 20 гадоў таму пачалася гісторыя новага будынка Нацыянальнай бібліятэкі, які стаў сапраўдным архітэктурным брыльянтам краіны, пацвярджэннем спрадвечнага імкнення беларусаў да ведаў.

На ваш калектыў ускладзена высакародная місія па захаванні культурнай спадчыны Беларусі, таму вельмі сімвалічна, што векавы юбілей бібліятэкі прыпаў на Год гістарычнай памяці.

У гэты святочны дзень хочацца з асаблівай цеплынёй адзначыць плённую працу некалькіх пакаленняў работнікаў, дзякуючы якім бібліятэка заваявала міжнародны аўтарытэт, любоў і ўдзячнасць чытачоў.

Жадаю вам доўгіх гадоў асветніцкай дзейнасці, здароўя, міру і дабрабыту", — гаворыцца ў віншаванні.

Да знамянальнай даты быў прымеркаваны IX Міжнародны кангрэс "Бібліятэка як феномен культуры", які адбыўся у Мінску 15-16 верасня.

У рамках Кангрэса прайшоў шэраг цікавых і разнастайных мерапрыемстваў: XXVI Агульны сход некамерцыйнага партнёрства "Бібліятэчная асамблея Еўразіі", дыскусійная пляцоўка "Электронныя рэсурсы: адкрыты дыялог выдаўцоў і бібліятэкараў", цырымонія гашэння спецыяльным памятным штэмпелем дзяржаўнага знака паштовай аплаты Рэспублікі Беларусь "100 гадоў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі", выстава выдавецкай прадукцыі.

Лепшым і заслужаным прадстаўнікам бібліятэчнай справы на ўрачыстым пасяджэнні былі ўручаны ўзнагароды Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь. Таксама вызначаны пераможцы Рэспубліканскага конкурсу "Бібліятэка — асяродак нацыянальнай культуры".

Вынікам кангрэса, удзел у якім прынялі больш за 350 дэлегатаў з Беларусі і блізкага замежжа — Расіі, Азербайджана, Казахстана, Таджыкістана, Узбекістана, — стала выпрацоўка рэзалюцыі па далейшым развіцці бібліятэчнай галіны, рэалізацыі мэт і задач дзяржаўнай палітыкі ў сферы культуры.

*Працяг тэмы на стар. 12*